**2. Адкажыце на пытанні.**

1) Які настрой у вас выклікае карціна мастака Юрыя Мікалаева «Хлябы»? Чаму?

2) Што адлюстравана на стале? Пералічыце.

3) Якія прадметы з'яўляюцца галоўнымі на карціне?

4) Як выглядаюць хлябы? Якія фарбы выкарыстаў мастак?

5) Чаму побач з хлябамі намаляваны каласы, зярняткі і соль?

6) У чым сугучны верш Петруся Броўкі «Песня хлебу» і карціна Юрыя Мікалаева «Хлябы»?

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаю...***

1. З якіх твораў узяты гэтыя словы? Хто іх аўтар?

а) Куды ні глянь — лясы шумяць,
за полем — рэчка, гай.
І ў сэрцы песні не стрымаць
пра мой любімы край;

б) Не проста ў словы я гуляю —
На мове роднай размаўляю.
У час світальны, вечаровы
Кажу пяшчоты цёплай словы...;



Правообладатель Национальный институт образования

в) «Падобная на хатнюю курыцу, шэрая цяцерка заўзята аддзірала кіпцюрамі верхні пласт сухога перагною. Цяцерка ратавала ад агню сваіх дзяцей!»;

г) Ах, як прывабна
Ён выглядае…
Я перад хлебам
Шапку здымаю.

2. Пра які сімвал Радзімы гаворыцца ў наступных радках?

«Наставіўшы белыя ветразі крылаў, плануюць (яны). Іх многія і многія тысячы. Гнёзды паўсюль. І таму мне здаецца, што зямлю нашу, Беларусь, можна назваць “зямлёю пад белымі крыламі”».

***Разумею, магу растлумачыць…***

1. Якой агульнай тэмай аб’яднаны ўсе вершы і апавяданні гэтага раздзела?

2. Чаму трэба цаніць і берагчы нашу спадчыну (мову, помнікі, сімвалы Беларусі)?

3. Як вы разумееце сэнс прыказкі «У чужой старонцы не так свеціць сонца»?



Правообладатель Национальный институт образования